## БУТРАМЕЕЎ УЛАДЗІМІР ПЯТРОВІЧ – 60

Нарадзіўся ў в. Расна Дрыбінскага раёна ў 1953 г. Скончыў геаграфічны факультэт Магілёўскага педінстытута (1974), працаваў настаўнікам у Чэрыкаўскім раёне. Пасля Чарнобыльскай аварыі школа патрапіла ў зону адсялення і ён пераехаў у Слонім, дзе працаваў на кардонна-папяровай фабрыцы і выкладаў у вячэрняй школе, супрацоўнічаў з мясцовым тэатрам. З 1988 г. супрацоўнічаў з Акадэмічным тэатрам імя Я. Купалы (Мінск), дзе за год да публікацыі ў друку была пастаўленая яго п'еса «Страсти по Авдею» («Крик на хуторе»), якая да сённяшняга дня ў рэпертуары тэатра. У 1989 г. пераехаў у г. Пушкіна Маскоўскай вобласці. Празаік, драматург, публіцыст, літаратуразнавец, сцэнарыст. Піша на рускай і беларускай мовах.

Пісаць пачаў яшчэ ў школе – вершы для насценгазеты, за якія быў узнагароджаны пуцёўкай ва Ўсесаюзны піянерскі лагер «Артэк». У інстытуце складаў жартоўныя вершы аб сваіх аднакурсніках і выкладчыках. Пакладзеныя на мелодыі вядомых песень, яны і зараз гучаць на сустрэчах выпускнікоў-географаў. У рэспубліканскім друку першыя аповесці апублікаваў у 1982 г. у часопісе «Сельская моладзь». Першую кнігу апавяданняў «Задорожье» здаў у выдавецтва «Мастацкая літаратура» у 1984 г.(выдадзена толькі ў 1994 г.). У гэты час у Маскве выйшлі яго кнігі апавяданняў «Любить и верить» (1986), «Сдвиженье» (1989), у Мінску – п'есы «И вновь Нестерка» (1986), «Казимир Лыщинский» (1989), «Чужие деньги» (2001). У 1987 г. У. Бутрамеева прынялі ў Саюз пісьменнікаў БССР і СССР, з 1999 – член Саюза пісьменнікаў Расіі.

У. Бутрамееў – аўтар шэрагу гісторыка-публіцыстычных твораў («Русская история для всех» (1994), «Мифы и легенды древних славян» (2009), «Верования и предания русского народа» (2010), літаратуразнаўчых («Хроника жизни и творчества И.А. Крылова» (2003), «Историко-литературные комментарии к изданию поэмы Н.В. Гоголя «Мертвые души» (2005), «Историко-литературные комментарии к роману А.С. Пушкина «Евгений Онегин» (2005), «Комментарии и хронология жизни и творчества Г.Х. Андерсена» (2007), «Комментарии и хронология жизни и творчества Якоба и Вильгельма Гримм (2007), «Историко-литературные комментарии к роману Л.Н. Толстого «Война и мир» (2008), літаратурных апрацовак («Остров сокровищ» (1993), «Три мушкетера» (1993), «Русская охота» (2011), «Русская рыбалка» (2012).

Ён зрабіў пераклады (Мацуо Басе, Амар Хайям і інш.), выдаў кнігі для дзяцей («Великие и знаменитые люди земли Белорусской» (1995), «Букварь» (2002), «Развивающий словарь русского языка в картинках от 3 до 5 лет» (2002), напісаў кінасцэнары мастацкіх фільмаў «Экзамен на директора» («Беларусьфільм», 1987) і «Аз воздам» («Беларусь – Польшча», 1993) і інш. У 1987 г. У. Бутрамееў скончыў у Маскве Вышэйшыя курсы сцэнарыстаў і рэжысёраў, у 1991 – Вышэйшыя літаратурныя курсы пры Літаратурным інстытуце імя М. Горкага. Лаўрэат літаратурных прэмій імя М. Горкага (СССР, 1987), «Лепшая пазнавальная кніга для дзяцей» (Расія, 1999), «Кніга года» (Расія, 2009).

*У.Г. Хамякоў*



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова